# МАЛАДОСЦЬ. ПРЫГАЖОСЦЬ. КРЭАТЫЎ

Штогод у інтэрнаце № 3 праходзіць конкурс прыгажосці і грацыі «Міс Вясна». Сёлета ў ім прынялі ўдзел сем дзяўчат. Кожная з іх праявіла сілу волі, стараннe, цярпенне на шляху да перамогі. Акрамя гэтага канкурсанткі змаглі прадэманстраваць свае творчыя і інтэлектуальныя здольнасці. У выніку званне «Міс Вясна» атрымала Анастасія Лісоўская, студэнтка 2-га курса ГФ. Пераможцай інтэрнэт-галасавання ў намінацыі «Міс глядацкіх сімпатый» стала Надзея Радзеўская, студэнтка 2-га курса ФлФ. Да таго ж былі названы пераможцы ў наступных намінацыях: «Віцэ-міс» – Ганна Качаненка, студэнтка 3-га курса МГФ, «Міс Арыгінальнасць» – Наталля Фамічова, студэнтка 3-га курса БФ, «Міс Крэатыў» – Вольга Нікіціна, студэнтка 1-га курса БФ, «Міс Грацыя» – Ганна Кавалёва, студэнтка 1-га курса БФ, «Міс Пяшчота» – Вераніка Мільто, студэнтка 3-га курса БФ.



Прыемна ўразіў гледачоў сваімі песнямі пад гітару студэнт 1-га курса гэтага ж факультэта Кірыл Макавецкі. Верш Сяргея Ясеніна прачытаў Віталь Лабацэвіч, студэнт 2-га курса ФМіІТ.

Прыз асабістай сімпатыі вырашылі ўручыць магістрант ГФ Валерый Коваль і магістрант ФСПіП Яўген Глушнеўскі. Валерый узнагародзіў салодкім падарункам Надзею Радзеўскую, а Яўген – Анастасію Лісоўскую.

Арганізатарам конкурсу выступіла Аліна Зуева, студэнтка 2-га курса БФ. За афармленне залы і інфармацыйную падтрымку адказвала Ганна Мельнікава, студэнтка 2-га курса ФлФ. А вёў мерапрыемства Аляксандр Лявонаў, студэнт 3-га курса БФ.

**Яўгенія ПУДАВА,**
**студэнтка 2-га курса ФлФ.**

**Фота з архіва інтэрната.**